**Анатоль Іванавіч Шушко (1954-2018) , беларускі паэт**



Анатоль Іванавіч Шушко нарадзіўся 19 ліпеня 1954 года ў вёсцы Сташаны Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. Сваімі першымі настаўнікамі лічыць маці Ганну Рыгораўну (Сякерыч), настаўніцу гісторыі і геаграфіі, і бацьку Івана Канстанцінавіча Шушко, а цікавасць да літаратуры прывіў выкладчык славеснасці ў школе Мікалай Сямёнавіч Купрэеў (1937–2004), які стаў вядомым пісьменнікам. Анатоль з дзяцінства сябраваў з Міколай Антаноўскім, які таксама захапляўся паэзіяй, стаў паэтам, журналістам.

У 1971 г. Анатоль Шушко паступіў на беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна. Пасля заканчэння БДУ (1976) — настаўнік Ласіцкай сярэдняй школы Пінскага раёна, Поразаўскай спецшколы-інтэрната Свіслацкага раёна. Працаваў рабочым і будаўніком на Міншчыне і Гомельшчыне, выхавальнікам Пінскай школы-інтэрната для дзяцей-сірот, вартаўніком, карэспандэнтам раённых газет.

Першы апублікаваны верш Анатоля Шушко з’явіўся ў газеце «Піянер Беларусі» (1969). Яшчэ школьнікам друкаваўся ў часопісе «Бярозка», газеце «Чырвоная змена». Пачаткам сапраўднага паэтычнага мастацтва можна лічыць падборку вершаў у штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва» (1971), якая з’явілася дзякуючы Варлену Бечыку. Вершы пачынаючага паэта адразу заўважыла літаратурная Беларусь, творчая інтэлігенцыя прарочыла яму вялікую літаратурную будучыню.

У 1981 г. Анатоль Шушко пабываў на рэспубліканскім семінары маладых літаратараў у Доме творчасці (Каралішчы), дзе былі такія вядомыя цяпер асобы: Анатоль Сыс, Алег Мінкін, Уладзімір Арлоў, Леанід Галубовіч, Васіль Сахарчук, Алесь Наварыч, Уладзімір Ягоўдзік і інш.

Вершы Анатоля Шушко друкаваліся ў часопісах «Полымя», «Беларусь», «Маладосць», «Нёман», «Беларуская думка», калектыўных паэтычных зборніках «На ладонях Припяти и Пины», «Маладыя галасы» (1985), «Галасы вёснаў» (1997), альманахах «Дзень паэзіі» (1991, 2005), «Люблю будзённы дзень» і ў расійскім альманаху «Москва» (у перакладзе В. Грышкаўца), а таксама ў цэнтральнай і мясцовай перыёдыцы.

У 1994 годзе ў серыі “Бібліятэчка часопіса «Маладосць»” пабачыла свет кніга А. Шушко з глыбокай філасофскай назвай «Выток і прычасце».

Анатоль Шушко – член Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1997 года. У 2006 годзе выйшаў з СБП і ўступіў у Саюз пісьменнікаў Беларусі.

У 2012 годзе выйшаў другі зборнік вершаў паэта «Шаны», за які ён атрымаў Дыплом II ступені Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «Лепшы твор 2012 года ў галіне паэзіі». Кнігай “Шаны” Анатоль Шушко

паставіў сябе ў адзін шэраг з лепшымі паэтамі Брэстчыны – Міколай Засімам, Міхасём Рудкоўскім, Міколай Купрэевым, Нінай Мацяш...

Анатоль Іванавіч ахвотна сустракаўся з чытачамі ў бібліятэках, з настаўнікамі і вучнямі ў школах, са студэнтамі, умеў па-мастацку чытаць свае творы. Штогод наведваў літаратурнае свята «Лунінская восень» на Лунінеччыне. Удзельнічаў у рабоце клуба літаратараў «Пінчукі», створанага ў 2016 г. пры раённай бібліятэцы імя Я. Янішчыц. Член Саюза беларускіх пісьменнікаў з сакавіка 1997 г.; у 2006 г. выйшаў з СБП і ўступіў у Саюз пісьменнікаў Беларусі. Лаўрэат літаратурнай прэміі імя У. А. Калесніка Брэсцкага аблвыканкама (2014). Да 60-годдзя паэта ў Пінскай ЦРБ імя Я. Янішчыц быў праведзены творчы вечар, на які прыйшлі родныя і сябры, а музычнае віншаванне падрыхтаваў народны фальклорна-этнаграфічны калектыў «Чабатухі» Сташанскага дома фальклору.

На працягу апошняга года жыцця Анатоль Шушко змагаўся з цяжкой хваробай, але не адышоў ад актыўнага грамадска-культурнага жыцця. Удзельнічаў у рэспубліканскім Дні беларускага пісьменства ў Іванаве, урачыстасці з нагоды надання звання «народны» літаратурна-краязнаўчаму музею Якуба Коласа ў Пінкавічах. 8 лістапада 2018 г. Анатоль Іванавіч Шушко заўчасна пайшоў з жыцця. Пакінуў пасля сябе багатую творчую спадчыну і добрыя ўспаміны. Рыхтаваў свой новы зборнік «Сэрцу соладка, ясна, трывожна», але выдадзены ён ужо пасмяротна ў маі 2019 г. У кнігу ўключылі вершы, прысвечаныя Анатолю Шушко, эсэ-ўспамін Таццяны Хвагінай. Да 65-годдзя з дня нараджэння паэта ў Пінскай ЦРБ імя Я. Янішчыц прайшоў вечар памяці.

**Творы А. Шушко**


1. **Сэрцу** салодка, ясна, трывожна : зборнік вершаў / Анатоль Шушко. – Мінск : “Деловая печать”, 2019. – 75 с.
2. **Шаны** : зборнік вершаў / Анатоль Шушко ; прадмова В. Гардзея. Мінск : Мінкапрынт, 2012. 192 с.
3. **Материнский** завет ; Попытка гекзаметра ; Валуны ; Стошанам ; На стежке в жите ; «…Мой долг неоплатный…» ; «…Зачем кричу подчас отчаянно…» : [стихи] / Анатоль Шушко // Белой Вежи свет : сб. поэзии Брестчины / сост. и пер. с бел. В. Гришковца. Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010. С. 82–85.
4. **Выток** і прычасце : вершы / Анатоль Шушко. Мінск : Полымя, 1994. 31 с. (Бібліятэчка часопіса «Маладосць», № 1 (67)).
5. **Адзінаму** ; Еўтэрпе ; Пінскі снег ; Перад настаннем дня : [вершы] / Анатоль Шушко // Дзень паэзіі – 2005. Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. С. 230–231.
6. **Вера** ; Сто шан для Сташан ; Вернасць ; Мова ; «Сонейка вясенняе мае..» ; «Хвілінку, шчасце пачакай» ; Чмель ; Сябрам : [вершы] / Анатоль Шушко // На ладонях Припяти и Пины : литературный альманах Пинщины. Минск : ОДО «Тонпик», 2004. С. 34–40.

7. **Слова** долі ; Перамога / Анатоль Шушко // Піншчына літаратурная : літ.-маст. зб. Пінск : Пінскі веснік, 1999. С. 68–70.
8. **Ты** – мой роздум аб шчасці ; Бурштынавыя ночы ; Любасці : [вершы] / Анатоль Шушко // Полесская правда, Пинск. 2013. 7 марта.
9. **Зямлячцы** : верш / Анатоль Шушко // Полесская правда, Пинск. 2013. 20 ноября. С. 6.
10. **Вячэрняму** Пінску ; «Не хавай нашу папараць…» ; «Святое неўзабаве застанецца…» ; «Зноў ля помніка маці стаю» ; «Пакрыёма праўда праяўляецца» : [вершы] / Анатоль Шушко // ЛіМ. 2012. 17 жніўня (№ 33). С. 8.
11. **Прызнанне** нашчадка ; Бацькава песня : [вершы] / Анатоль Шушко // ЛіМ. 2012. 4 мая (№ 18). С. 8.
12. **Маёй** Беларусі ; Просьба да сонца ; «Час родзіць паэтаў у нас» ; Баладнае ; Вершапад ; След ; Ушушканы ўспамінам ; Кветка волі. Балада белых руж на іспанскі матыў : [вершы] / Анатоль Шушко // Полымя. 2011. № 11. С. 32–37.
13. **Камяні** ; Пацеры да мовы ; Каханне : [вершы] / Анатоль Шушко // Маладосць. 2011. № 8. С. 46.
14. **Касьба** з водарам настальгіі : [верш] / Анатоль Шушко // ЛіМ. 2011. 22 красавіка.
15. **Віншаванка**. Дзве тысячы дзесятым! : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2009. 31 снежня.
16. **“Нядзіўна”** : Караткевічу : [верш] / Анатоль Шушко // Полесская правда (Пинск). 2010. 18 декабря.
17. **Стошанам** ; На стежке в жите ; Попытка гекзаметра ; Валуны : [стихи] / Анатоль Шушко ; пер. В. Гришковца // Нёман. 2011. № 6. С. 98–99.
18. **Спешу** напиться звуками и словом… : [стихи] / Анатоль Шушко ; пер. с бел. А. Аврутина // Нёман. 2008. № 10. С. 100–101.
19. **Шчырае** ; На далонях вясны ; «Прыгажосць выратуе свет» : [вершы] / Анатоль Шушко // Заря. 2008. 31 июня.
20. **Прачулае** і весняе : [верш] / Анатоль Шушко // Заря. 2008. 14 февраля.
21. **Навізна** : [верш] / Анатоль Шушко // Народная газета. 2008. 21 лістапада.
22. **Гады**. Сыну Віталіку : [верш] / Анатоль Шушко // Заря. 2008. 15 мая.
23. **«Знаёмая** мара паехаць у Брэст» ; «Кашулю шылі навырост» : [вершы] / Анатоль Шушко // Маладосць. 2007. № 11. С. 58–60.
24. **Пінскі** вальс : [песня] / словы Анатоля Шушко ; музыка Алеся Жуковіча // Пінскі веснік. 2007. 5 кастрычніка.
25. **Франтавіку**, чалавекалюбу Зіновію Вагеру ахвярую : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2007. 16 кастрычніка.
26. **Метаморфоза** : [стихи] / Анатоль Шушко ; пер. с бел. В. Гришковца // Нёман. 2007. № 8. С. 57.
27. **Пінскі** снег : [верш] / Анатоль Шушко // Белорусская нива. 2007. 6 февраля.

28. **Імгненнае**; Элегічнае; Радзімнае: [вершы] / Анатоль Шушко // Заря. 2007. 18 октября.
29. **Радзіме**: Просьба : [вершы] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2007. 3 студзеня.
30. **Маёй** Беларусі : [верш] / Анатоль Шушко // Заря. 2007. 22 ноября.
31. **Думка** ; Каханне ; Сынам ; Ідылічны накцюрн ; Удзячнасць ; Надзейнасць : [вершы] / Анатоль Шушко // Маладосць. 2006. № 11. С. 70–71.
32. **Чмель**: [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2006. 18 красавіка
33. **Халасцяк**; Графаман : [вершы] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2006. 10 лістапада.
34. **Чараўніца** : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2011. 3 верасня.
35. **Лаўровіч, М.** Вершы / Мікалай Лаўровіч ; пер. з рускай мовы Анатоля Шушко // Маладосць. 2006. № 11. С. 52.
36. **Сынавым** радком : [верш] / Анатоль Шушко // Полесская правда (Пинск). 2006. 17 июня.
37. **Да бацькавага васьмідзесяцігоддзя**. Да крэўнага франтавіка : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2006. 16 чэрвеня.
38. **Пінская** буслiная балада (дыялог з аднакурніцай праз 60 год пасля вайны) ; Дыялог у Пінску ; Да восені : [вершы] / Анатоль Шушко // Заря. 2005. 25 октября.
39. **Грышкавец, В.** «У мяне дзве матулі» ; Ліст услед ; «…І ад каханкі на світанку на цягнік…» ; «Знайсці, прыняць і пакахаць» ; «Ў дарозе ці дома, калі я адзін…» ; «Ўваб’ю калочак свой ахвотна…» : [вершы] / Валерый Грышкавец ; пер. з рускай мовы Анатоль Шушко // ЛіМ. 2005. 23 верасня. С. 11.
40. **В родимой** белорусской стороне : [стихи] / Анатоль Шушко ; пер. с белор. В. Гришковца // Нёман. 2005. № 7. С. 79–80.
41. **Ушушканы** ўспамінам : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2005. 11 сакавіка.
42. **Вясеннія** паразуменні з Уладзімірам Караткевічам : трыпціх ; Сват ; На памяць ; З татам : [вершы] / Анатоль Шушко // ЛіМ. 2005. 24 чэрвеня (№ 25). С. 8.
43. **Ад сэрца**; Прызнанні палешука : [вершы] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2005. 21 кастрычніка.
44. **Вернасць** : [верш] / Анатоль Шушко // Полесская правда, Пинск. 2005. 12 ноября.
45. **Вось** ён - напісаны верш!; Цішыня : [вершы] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2005. 4 студзеня.
46. **Перад** настаннем дня; Навальніца; Георгію Андрэеву: [вершы] / Анатоль Шушко // Заря. 2005. 27 мая.
47. **Пінская** буслiная балада; Дыялог у Пінску; Да восені : [вершы] / Анатоль Шушко // Заря. 2005. 25 октября.
48. **Голас** кветак : [верш] / Анатоль Шушко // Белорусская нива. 2005. 19 апреля.

49. **Весні** матыў ; Вясна ; Майскаму ранку дома на ганку ; Дзякую ; Санет яднання : [вершы] / Анатоль Шушко // ЛіМ. 2004. 22 кастрычніка (№ 42). С. 8.
50. **Прыпамінальнае**; "Ніхто не ўмее плакаць, як паэт"; У блакнот; Хай жывуць студэнты!!!; Жартоўна-гумарыстычнае, сумесна суцяшальнае!; На купалле; Дыфірамб; На сцежцы ў жыцце : [вершы] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2004. 16 ліпеня.
51. **Да юбілею;** Наступства сонечных промняў : [вершы] / Анатоль Шушко // Заря. 2004. 14 августа.
52. **Да юбілею;** Мове; У дзень нараджэння; Наступства сонечных промняў; Навальніца : [вершы] / Анатоль Шушко // Полесская правда, Пинск. 2004. 17 июля.
53. **Семья** : [верш] / Анатоль Шушко // Полесская правда, Пінск. 2004. 7 февраля.
54. **Са святам!** : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2004. 5 сакавіка.
55. **Прывітальнае** : [верш] / Анатоль Шушко // Полесская правда, Пинск. 2004. 30 октября.
56. **Сонейка** вясенняе маё; Хвілінку, шчасце, пачакай : [вершы] / Анатоль Шушко // Полесская правда, Пинск. 2004. 20 марта.
57. **"Слязу** меў, бо жыць хацеў!.." або Нечаканы маналог таты : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2004. 2 ліпеня.
58. **Франтавік**; Дыялог : [вершы] / Анатоль Шушко // Полесская правда, Пинск. 2004. 2 июля.
59. **Спатканне**; "Вось ён - напісаны верш!"; Выпускнікам горада Пінска : [вершы] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2004. 1 чэрвеня.
60. **Сташанам** : [верш] / Анатоль Шушко // Полесская правда, Пинск. 2004. 22 марта.
61. **Золак** на волі ; Дыялог з воляю ; «Воно» : [вершы] / Анатоль Шушко // ЛіМ. 2003. 19 снежня. (№ 51–52). С. 8.
62. **Услед**: Васілю Сахарчуку : [вершы] / Анатоль Шушко // Полесская правда, Пинск. 2003. 1 мая.
63. **Дыялог** ля роддома; Віншавальнае : [вершы] / Анатоль Шушко // Полесская правда, Пинск. 2003. 7 марта.
64. **Каханы** : [верш] / Анатоль Шушко // Полесская правда, Пинск. 2003. 12 апреля.
65. **Майскаму** ранку дома на ганку; Шлях у чалавечнасць: [вершы] / Анатоль Шушко // Полесская правда. Пинск. 2002. 8 мая.
66. **Пацеры** да мовы : [вершы] / Анатоль Шушко // Белорусская нива. 2002. 12 декабря.
67. **Просьба** да сонца : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2002. 23 жніўня.
68. **Твой** самы; Мроя ў пінскім аўтобусе; Непаўторнасць; З парога : [вершы] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2002. 20 верасня.
69. **Свята** Перамогі : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2002. 8 мая.

70. **Чацвёрты** блок у сэрцы Стрыжака ; «Замаўляючы сабой бяседу…» ; «Распавёў ты сваё КОЛІСЬ сэрцам» ; «Ды пра што я, Божа напрамілы?!» ; Міколу Цялегу ; Мове ; Дыялог сучаснікаў : [вершы] / Анатоль Шушко // Маладосць. 2001. № 5. С. 27–31.
71. **Сват** : [верш] / Анатоль Шушко // Полесская правда, Пинск. 2001. 3 мая.
72. **Апасля** сваркі; Настальгічнае; На сцежцы ў жыце; Вясна; З парога: [вершы] / Анатоль Шушко // Провинциалка. 2001. 23 августа.
73. **Мяцеліца** ; Снег ; Іней : [вершы] / Анатоль Шушко // Раніца. 2001. 22 сакавіка.
74. **Навагодняя** застольная; Прызнанне; На прысвятак Ганны ў бацькоўскай хаце; Дзеўне з Беларусі; Да восені; Крынічка; Радасць : [вершы] / Анатоль Шушко // Полесская правда, Пинск. 2001. 29 декабря.
75. **Мова** ; Замест «бывай!» ; Вецер ; «Як зазірну ў сховішча душы…» ; «Гудуць чмялі, спагадны бас ля хаты» ; «Кім стаць хацеў у працы, у жыцці?» ; «Добры дзень! Родны ранак душы» : [вершы] / Анатоль Шушко // Беларуская думка. 2000. № 10. С. 165–167.
76. **Тень** вечности : [стихи] / Анатоль Шушко ; пер. В. Гришковца // Нёман. 2000. № 2. С. 155–156.
77. **Маладым**; Бацьку : [вершы] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2000. 5 мая.
78. **Маналог** былога кінолага-пагранічніка Івана Бандарчука : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2000. 26 мая.
79. **Вясновы** верлібр : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 2000. 28 красавіка.
80. **Беларусі** ; На сцежцы ў жыце ; Сум ; Чараўніца : [вершы] / Анатоль Шушко // ЛіМ. 1999. 8 кастрычніка. С. 8.
81. **Сябру** : [верш] / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. 1999. 31 жніўня.
82. **З кнігі** лірыкі «Словы долі» : [вершы] / Анатоль Шушко // Маладосць. 1998. № 5. С. 98–103.
83. **«Зляпіў** мяне мой Бог з памылак» ; «А думка прагне адкрыцця…» : [вершы] / Анатоль Шушко // ЛіМ. 1998. 24 красавіка (№ 17). С. 9.
84. **Вас** не клікалі зоры?; Вясна; Чаму; Кім стаць хацеў?; Купалаўскае : [вершы] / Анатоль Шушко // Пинская неделя. 1998. 27 февраля.
85. **«Светятся** леса – в лучах осин…» ; Метаморфоза : [стихи] / Анатоль Шушко ; пер. В. Гришковца // Москва. 1997. № 10. С. 6.

**Аб жыцці і творчасці А. Шушко**

1. **Анатоль Шушко** // Літаратурная карта Берасцейшчыны / укл. А. Крэйдзіч. Брэст, 2008. С. 479–481.
2. **Гардзей, В.** Шаны вам, Сташаны / Віктар Гардзей : рэц. на кнігу "Шаны". – Мінск: Мінкапрынт, 2012.
3. **Ляшук, М.** Ляціць ягоны верш да небакраю / Марыя Ляшук // ЛіМ. 2014. 12 снежня (№49). С. 12.

4. **Алея** гарадоў-сталіц, “Баркулабаўскі летапіс” і …: [дыплом II ступені Рэспубліканскага конкурсу “Лепшы твор 2012 года ў галіне паэзіі” атрымаў у Быхаве А. Шушко] // Народная трыбуна. 2013. 6 верасня. С. 4.
5. **Бензярук, Р.** Ушукшаны Сташанамі / Расціслаў Бензярук // ЛіМ. 2012. 21 снежня. С. 10.
6. **Локун, В.** Цэнтрам быційнай прасторы : [агляд твораў, у т. л. кнігі А. Шушко «Шаны»] / Валянціна Локун // Маладосць. 2013. № 10. С. 56–58.
7. **Яцук, А.** Шаны Сташанам. І не толькі… / Алег Яцук // Полымя. 2013. № 3. С. 180–183.
8. **Гришковец, В.** «Сто шан, паэт!» : [о книге стихов А. Шушко “Шаны”] / Валерий Гришковец // Полесская правда, Пинск. 2013. 9 января. С. 3; Заря. 2013. 24 января. С. 19.
9. **Гришковец, В.** Мера жита – мера слова: жизнь! : [о книге стихов А. Шушко «Шаны»] / Валерий Гришковец // Нёман. 2013. № 1. С. 208–211.
10. **Яцук, А.** Шаны Сташанам. І не толькі… / Алег Яцук // Полымя. 2013. № 3. С. 180–183.
11. **Гарадніцкі, Я.** Паэзія – 2011: зямное і ўзвышанае : [аб падборцы вершаў А. Шушко ў часопісе «Полымя»] / Яўген Гарадніцкі // Полымя. 2012. № 10. С. 179–180.
12. **Бензярук, Р.** Ушушканы Сташанамі / Расціслаў Бензярук // ЛіМ. 2012. 21 снежня. С. 10.
13. **Бензярук, Р.** Сто шан вам, Сташаны! : Доўга, вельмі доўга Анатоль Шушко, таленавіты паэт з Пінска, чакаў сваёй другой кнігі / Расціслаў Бензярук // Народная трыбуна. 2012. 14 снежня.
14. **Макарэвіч, С.** Гучыць слова земляка над роднаю старонкаю : [сустрэча паэта А. Шушко са студэнтамі Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта] / Святлана Макарэвіч // ЛіМ. 2012. 27 ліпеня (№ 30). С. 22.
15. **Кузьміч, П.** Вылучаны на рэспубліканскую прэмію : [Шушко Анатоль Іванавіч] / П. Кузьміч // ЛіМ. 2008. 25 студзеня. С. 22.
16. **Галубовіч, Л.** Сто шан! **:** [Анатолю Шушко – 50] / Леанід Галубовіч // ЛіМ. 2004. 23 ліпеня. С. 5.
17. **Приступа, Н.** Пятьдесят его дорог : члену Союза белорусских писателей Анатолию Шушко – 50 лет / Наталья Приступа // Пінскі веснік. 2004. 16 ліпеня. С. 3.
18. **Лаврович, Н.** Ни дня без поиска / Николай Лаврович // Пінскі веснік. 2004. 16 ліпеня. С. 3.
19. **Гришковец, В.** Анатолю Шушко – 50 / Валерий Гришковец // Полесская правда, Пинск. 2004. 17 июля.
20. **Кантор, Д.** От народных криниц : [о заседании клуба «Натхненне» при районной библиотеке им. Е. Янищиц, посвященное поэту А. Шушко] / Дмитрий Кантор // Полесская правда, Пинск. 2002. 8 мая.

21. **Маринчик, И.** Как ждут того, кто не обманет : встреча с поэтом А. Шушко / И. Маринчик // Полесская правда (Пинск). 1998. 11 марта.
22. **Самуйлик, М.** Анатолия Шушко читают в Москве / М. Самуйлик // Полесская правда, Пинск. 1998. 14 марта.
23. **Самуйлик, М.** Горит его Звезда : [о творчестве А. Шушко] / М. Самуйлик // Пинская неделя. 1998. 27 февраля.
24. **Прыняты** ў Саюз пісьменнікаў : [Шушко Анатоль Іванавіч] // ЛіМ. 1997. 28 сакавіка. С. 4.
25. **Путь** в большую поэзию начался в Стошанах // Полесская правда, Пинск. 1997. 15 февраля.
26. **Гардзей, В.** Паэты з вёскі Сташаны / Віктар Гардзей // Чырвоная змена. 1997. 27 мая.
27. **Талкачоў, С.** Са сваім адчуваннем свету : [пра паэзію А. Шушко] / Сяргей Талкачоў // Пінскі веснік. 1997. 15 красавіка.
28. **Патаранскі, С.** Паэт – ён нечаканасць… (Роздум над кнігай Анатоля Шушко «Выток і прычасце» і пра сучасную паэзію наогул) / Сяргей Патаранскі // Першацвет. 1995. № 5. С. 129–131.
29. **Стрыгалёў, М.** Агмень паэзіі сапраўднай. «І маразы, і лета пах…» («Выток і прычасце» Анатоля Шушко) / Міхась Стрыгалёў // Маладосць. 1995. № 4. С. 251–253.
30. **Патаранскі, С.** Паэт - ён нечаканасць… / Сяргей Патаранскі // Першацвет, 1995. № 5. С. 129–131.
31. **Галубовіч, Л.** Свая азнака : [рэц. на кнігу А. Шушко «Выток і прычасце»] / Леанід Галубовіч // Полымя. 1994. № 7. С. 254–256.
32. **Грышкавец, В.** Выток і прычасце / Валерый Грышкавец // Полесская правда, Пинск. 1994. 1 октября // Пінскі веснік. 1994. 28 верасня.
33. **Папічыц, В.** Свята паэзіі і песні : [у в. Сташаны віталі сваіх землякоў-паэтаў М. Антаноўскага і А. Шушко] / В. Папічыц // Пінскі веснік. 1994. 22 чэрвеня.
34. **Бечык, В.** Будзем знаёмы : Анатоль Шушко / Варлен Бечык, Мікола Гіль // ЛіМ. 1971. 6 жніўня.